

Рыта МІШЫНА

# СВЕТ СТАРАЖЫТНАЙ ГІСТОРЫІ

*V клас*

***Вучням, якія толькі пачынаюць знаёміцца са светам гісторыі, вельмі важна прывіць цікавасць і любоў да яе. Для гэтага на першым уроку трэба паказаць, чаму неабходна ведаць гісторыю і колькі захапляльнага можна даведацца падчас яе вывучэння.***

**Мэты ўрока:** пазнаёміць вучняў з прадметам "гісторыя", абудзіць цікавасць да яе.

**Задачы ўрока:** пазнаёміць вучняў з паняццямі: гісторыя, сусветная гісторыя, першабытнасць, Старажытны свет (старажытнасць), гістарычныя крыніцы, археалогія, этнаграфія, міф; развіваць навыкі работы з вучэбным дапаможнікам, сшыткам, картай, гістарычным атласам; развіваць уменні знаходзіць адказы на пытанні, сістэматызаваць дадатковую інфармацыю, рабіць вывады; выхоўваць павагу да гістарычнай спадчыны.

**Тып урока:** урок засваення новых ведаў з элементамі прафесійнага самавызначэння.

**Забеспячэнне ўрока:** Гісторыя Старажытнага свету: вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / Пад рэд. У.С.Кошалева. Мн., 2009; Атлас. История Древнего мира. 5 класс / И.А.Авдеев и др. Мн., 2009; макеты дрэва і рамонка.

На дошцы размяшчаюцца макеты дрэва і рамонка. На ствале дрэва запісана слова "гісторыя". Надпісы на галінках дрэва ў пачатку ўрока закрыты. Па ходу вывучэння новых паняццяў надпісы на галінках адкрываюцца.

## План урока

**I.** Арганізацыйна-матывацыйны этап.

**II.** Падрыхтоўка вучняў да засваення новых ведаў.

**III.** Вывучэнне новага матэрыялу.

1. Што такое гісторыя?
2. Гістарычныя крыніцы.
3. Гісторыя — аснова для многіх цікавых прафесій.

**IV.** Замацаванне вывучанага матэрыялу.

**V.** Рэфлексія.

**VI.** Дамашняе заданне.

На класнай дошцы запісаны эпіграф:

*Гісторыя — настаўніца жыцця.* **Цыцэрон.**



***МІШЫНА Рыта Іванаўна.***

*Нарадзілася ў г. Шчучын Гродзенскай вобл. У 1987 г. закончыла гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.Куляшова. З 1988 г. працуе настаўніцай гісторыі Забродскай сярэдняй школы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.*



gisdapamoga.bspu.by

## Ход урока

### І. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

Настаўнік знаёміцца з вучнямі класа, рыхтуе іх да сумеснай работы.

### ІІ. Падрыхтоўка вучняў да засваення новых ведаў.

Настаўнік расказвае вучням, як трэба працаваць з вучэбным дапаможнікам, знаёміць з патрабаваннямі да сшыткаў па гісторыі. На першым уроку гісторыі настаўнік коратка знаёміць вучняў з фізічнай картай свету, на яе прыкладзе паказвае, як карыстацца картай, тлумачыць, для чаго патрэбны атласы.

Далей вядзецца размова з класам па наступных пытаннях: *Што такое, на ваш погляд, гісторыя? З якім гістарычным матэрыялам вы сустракаліся на ўроках у пачатковай школе? Якія падзеі беларускай мінуўшчыны вы ведаеце? Раскажыце, што вы ведаеце пра беларускіх гістарычных дзеячаў? Якія даты з айчыннай гісторыі вы памятаеце? Што адбылося ў гэтыя гады (стагоддзі)? Як вы думаеце, для чаго мы вывучаем гісторыю?*

### ІІІ. Вывучэнне новага матэрыялу.

#### 1. Што такое гісторыя?

Вучні самастойна чытаюць пункт 1 § 1—2 вучэбнага дапаможніка і адказваюць на пытанне: *Якія значэнні мае слова "гісторыя" ў прыведзеных выказваннях?*

Пасля заслухоўвання адказаў настаўнік адзначае, што слова "гісторыя" мае грэчаскае паходжанне. Далей сумесна з вучнямі ён тлумачыць эпіграф урока.

Пасля абмеркавання эпіграфа вучням прапануецца адшукаць у вучэбным дапаможніку на с. 4 у пункце 2 азначэнне паняцця "гісторыя". У сшытку запісваецца наступнае: "*Гісторыя — навука пра жыццё людзей у мінулым*".

Выкарыстоўваючы фізічную карту свету, настаўнік тлумачыць вучням, што азначае паняцце "сусветная гісторыя". *(Пасля тлумачэння адкрывае на галінцы надпіс "сусветная гісторыя".)*

Далей адзначае, што далёкае мінулае вывучае гісторыя старажытнага свету (старажытнасць), аднак гісторыя — гэта не толькі далёкія падзеі, але і ўчарашні дзень. *(Адкрываем на галінцы дрэва надпіс "Старажытны свет").* Гісторыя старажытнага свету дзеліцца на два вялікія перыяды — першабытнасць і гісторыя Старажытнага свету. *(Настаўнік расказвае асаблівасці гэтых перыядаў і адкрывае адпаведныя надпісы на галінцы дрэва.)*

#### 2. Гістарычныя крыніцы.

Паняцці "гістарычныя крыніцы, рэчавыя крыніцы, пісьмовыя крыніцы, археалогія, міфы" вывучаюцца з дапамогай каменціраванага чытання тэксту § 1—2 вучэбнага дапаможніка на с. 5—6. Азначэнні запісваюцца ў сшытак, адкрываюцца адпаведныя надпісы на галінках дрэва.

#### 3. Гісторыя — аснова для многіх цікавых прафесій.

З улікам наяўнасці часу настаўнік расказвае аб прафесіях (або прафесіі) людзей, для якіх неабходна ведаць гісторыю. Свой расказ пажадана суправаджаць наглядным матэрыялам — ілюстрацыямі, экспанатамі школьнага гістарычнага музея. Школьнікам таксама можна прадэманстраваць рамонак, у цэнтры якога напісана слова "гісторыя", а на пялёстках назвы прафесій, звязаных з гісторыяй.

Настаўнік задае вучням пытанні: *Як сучасныя людзі даведваюцца, што адбывалася ў мінулым? З дапамогай якіх рэчаў? Што пакінулі нам продкі?*

*Настаўнік.* Гісторыя з'яўляецца асновай для шматлікіх прафесій: вучоных-гісторыкаў, настаўнікаў гісторыі, археолагаў, экскурсаводаў, этнографаў, юрыстаў, дыпламатаў. Раскажам крыху пра адны з самых цікавых: этнографа, археолага.

*Этнограф* — гэта спецыяліст, які вывучае гісторыю народаў, іх побыт, культуру, традыцыі. Будучы этнограф павінен быць гатовы падарожнічаць, ведаць некалькі моў, быць камунікабельным, фізічна трывалым, дапытлівым, валодаць аналітычным складам розуму, добрай памяццю, уменнем слухаць і чуць.

*Археолаг* — гэта вучоны, які вывучае быт і культуру старажытных цывілізацый па захаваных матэрыяльных рэштках іх жыццядзейнасці. Археолаг праводзіць раскопкі для выяўлення старажытных рэчаў і прадметаў. Археалогія — творчая прафесія, бо даводзіцца выкарыстоўваць фантазію і абстрактнае мысленне, каб аднавіць карціну мінулага. Часам для адкрыцця таямніцы старажытнай культуры або археалагічнага помніка праходзяць гады, дзесяцігоддзі і нават стагоддзі.

Адна з асноўнай дзейнасці археолага — гэта правядзенне раскопак для пошуку помнікаў старажытнасці. Каб стаць археолагам, трэба мець добрую фізічную падрыхтоўку, ведаць гісторыю, умець добра маляваць, быць разважлівым.

Пасля расповяду настаўніка вучні праглядаюць адну з серый тэлеперадачы "Есть такая профессия", у якой расказваецца пра прафесію археолага. *(Выкарыстоўваюцца матэрыялы сайта http://www.karusel-tv.ru)*

*Настаўнік.* Неабавязкова быць прафесійным гісторыкам, каб вывучаць гісторыю сваёй малой Радзімы. Ёсць аматары гісторыі — краязнаўцы, якія вывучаюць асобныя мясцовасці краіны з пункту гледжання геаграфічных, культурных, гістарычных, эканамічных, этнаграфічных асаблівасцей.



Слуп з законамі Хамурапі.

Краязнавец — чалавек, які займаецца вывучэннем свайго краю, краязнаўствам.

### IV. Замацаванне новага матэрыялу.

Настаўнік прапануе вучням разам закончыць наступныя сказы:

Гісторыя — гэта ...

Гісторыя Старажытнага свету дзеліцца на два перыяды: ...



Таблічка з клінапісным тэкстам законаў Хамурапі.

Веды аб мінулым мы атрымліваем з ...

Вывучаць гісторыю дапамагаюць наступныя навукі ...

Прафесіі, для якіх неабходны веды па гісторыі — гэта...

Пасля выканання задання разам з вучнямі вусна фармулююцца вывады ўрока.

1. Гісторыя — навука аб жыцці людзей у мінулым.
2. Па гістарычных крыніцах — рэчавых і пісьмовых — мы даведваемся аб тым, што адбывалася ў старажытнасці.
3. Археалогія і этнаграфія — навукі, якія дапамагаюць вывучаць гісторыю.
4. Кожнаму чалавеку трэба ведаць гісторыю сваёй Радзімы, цікавіцца гісторыяй іншых краін і народаў свету.
5. Гісторыя неабходна для атрымання розных прафесій.

### V. Рэфлексія.

Вучні выказваюць сваё стаўленне да ўрока. Ім прапануецца вусна закончыць наступныя сказы:

Я даведаўся...

Я задумаўся над тым, што...

Я раскажу сваім сябрам пра...

Мне цікава...

### VI. Дамашняе заданне.

Прачытаць § 1—2 (п. 1, 2, 3), вусна адказаць на пытанні 1—4 на с. 7.